ДУК "САЛІГОРСКАЯ РАЁННАЯ ЦЭНТРАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА"
АДДЗЕЛ МАРКЕТЫНГУ, САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ
І МЕТАДЫЧНАЙ РАБОТЫ





# Максім Лужанін



## Метадычныя парады

да 115-годдзя з дня нараджэння беларускага празаіка, паэта, кінадраматурга, перакладчыка, крытыка





2024



# Максім Лужанін

**(1909 – 2001)**

У гэтага чалавека шчаслівы лёс, бо шчасце паэта цесна звязана з лёсам народа, з лёсам зямлі, з лёсам людзей, якія жывуць на гэтай зямлі. А наш зямляк, таленавіты паэт і празаік Максім Лужанін без людзей, без Радзімы ніколі сябе не ўяўляў, а заўсёды крочыў з імі адной дарогай. Нездарма ў яго душы нарадзіліся такія шчырыя, прыгожыя паэтычныя радкі:

Нідзе не дзенуся з Беларусі,
Кім пажадае, тым і вярнуся, -
Жыло, жыве і жыць застанецца
Тут маё сэрца.

Максім Лужанін (сапраўднае прозвішча Аляксандр Амвросьевіч Каратай) нарадзіўся 2 лістапада 1909 года ў вёсцы Прусы. Алесю было чатыры гады, калі ён узяўся за кніжку, і быў гэта “Князь Сярэбраны” Аляксея Талстога. Потым была школа. Спачатку ў Прусах, потым у Слуцку, а заканчваў сямігодку ў Чырвонай Слабадзе.



Вучні Чырвонаслабодскай сямігодкі падчас экскурсіі ў Слуцк.Сядзяць (злева направа): Максім Лужанін, Пракоп Матруховіч. Стаяць: Юзік Бялькевіч, Гаўрыла Понтус, Віктар Сарока. 1924 г.

Пасля заканчэння Чырвонаслабодскай сямігодкі ў 1924г. паступіў у Мінскі педагагічны тэхнікум. З 1925 г. пачаў друкавацца, уступіў у літаратурнае аб’яднанне “Маладняк”, удзельнічаў у рабоце 1-га з’езда гэтай арганізацыі ў лістападзе 1925 г. На гэтым з’ездзе прысутнічаў і Я. Купала. А праз тры гады, у 1928 г., убачыў свет і першы паэтычны зборнік пад назваю “Крокі”. Паэту было тады 18 гадоў.



Максім Лужанін у 1928 г.

У маладога паэта былі вялікія планы, якія, на жаль, былі раптоўна парушаны. 10 жніўня 1933 года ў дзверы кватэры, дзе жыў паэт з жонкаю, настойліва пастукалі супрацоўнікі НКУС, і ў гэтую ноч М. Лужанін быў арыштаваны, абвінавачаны ў нацдэмаўшчыне і асуджаны на два гады пазбаўлення волі. Рэабілітаваны паэт быў толькі ў 1956 г.

Хапіла яму і ваеннага ліхалецця. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны, у жніўні 1941 г., М. Лужанін быў накіраваны ў Падольскае пяхотнае вучылішча, пасля заканчэння якога ў 1942 г. быў адпраўлены ў Сталінград, дзе ішлі цяжкія баі. Пасля ён актыўна супрацоўнічаў у беларускіх выданнях, што выходзілі ў гады вайны ў Маскве – гэта газета “Савецкая Беларусь” і сатырычная




Пасведчанне Максіма Лужаніна аб працы адказным сакратаром газеты-плаката "Раздавім фашысцкую гадзіну", 1945 г.

газета-плакат “Раздавім фашысцкую гадзіну”, дзе друкаваліся яго творы пад



Максім Лужанін на фронце, пачатак 1943 г.

псеўданімам Алесь Даведка. Творы ваеннага часу потым склалі кнігу “Шырокае поле вайны”, якая выйшла ў свет у пераможным 1945 г.

Пасля вайны Максім Лужанін прыязджае ў Мінск і працуе ў газеце “Звязда”, у часопісе “Вожык”, у Акадэміі навук БССР.

У пасляваенны час талент пісьменніка разгарнуўся на поўную сілу. Ён працаваў у розных жанрах літаратуры – гэта і паэзія, і проза, і дакументалістыка, гумар і сатыра, публіцыстыка, мастацкі пераклад, кінадраматургія. Але найперш ён – паэт, які пакінуў нам у спадчыну дзясяткі сваіх паэтычных зборнікаў, такіх, як “Святло Радзімы”, “Паразмаўляй са мной, зямля”, “Вярнуся ветрам”, “Росы на коласе”, “Гэта было ў Беларусі”, “Лявоніха”, “Шумелі бярозы”, “Пачатак чалавека”, “Вокны дарогі”, “Прага крыла” і іншыя. Вядомы беларускі літаратурны крытык, таксама наш зямляк, Рыгор Шкраба пісаў: “Сустрэча з сапраўднай паэзіяй – заўсёды свята для чытача. Нямала такіх свят прынёс М. Лужанін за свой ужо немалы творчы шлях.” А працаваў ён у беларускай літаратуры аж 76 гадоў. Апошні сшытак сваіх новых вершаў М. Лужанін напісаў, калі паэту было ўжо 92 гады. Паспяхова выступаў М. Лужанін і ў жанры прозы, у тым ліку і дзіцячай. Ён выдаў кнігі “Вачыма часу”, “Дванаццаць вячорных вогнішчаў”, “Людзі, птушкі, прастор”, “Рэпартаж з рубцом на сэрцы”, “Сустрэчы”, “Наўздагон за падвойнікам”, “Добры хлопец Дзік”.



Яўгенія Эргардаўна Пфляўмбаўм – жонка М.Лужаніна, беларуская паэтэса

У 60-ыя гады М. Лужанін працаваў на кінастудыі “Беларусьфільм”. Спачатку быў членам сцэнарнай калегіі, а потым галоўным рэдактарам кінастудыі. Менавіта ў гэты час кінастудыя выпусціла найбольшую колькасць мастацкіх фільмаў, якія склалі яе залаты фонд. Гэта такія фільмы, як “Альпійская балада”, “Трэцяя ракета”, “Праз могілкі”, “Горад майстроў”, “Анюціна дарога”, “Іван Макаравіч”, “Жыццё і ўзнясенне Юрыя Братчыка”, “Я, Францыск Скарына”, “Сыны ідуць у бой”, “Вясенняя казка”, “Першыя выпрабаванні”, “Паўлінка”. Мастацкі фільм “Першыя выпрабаванні” быў зняты па сцэнарыі, напісаным М.



На адпачынку з унучкай, Паўлам Кавалёвым і Андрэем Макаёнкам

Лужаніным сумесна з А. Куляшовым па матывах рамана Я. Коласа “На ростанях”. Кожны з гэтых фільмаў М. Лужаніну фактычна прыходзілася прабіваць у вышэйшых цэнзурных кругах, даказваючы неабходнасць выхаду гэтых фільмаў у той час, адстойваў цэласнасць фільмаў, даказваў вартнасць той ці іншай сцэны ў фільме. І ўсе гэтыя фільмы выйшлі ў шырокі пракат дзякуючы іменна настойлівасці М. Лужаніна.

Асобную старонку ў біяграфіі нашага земляка займае яго знаёмства з Я. Коласам. Пачынаючы з 1946 года М. Лужанін на працягу 10 год, да 1956 г., быў асабістым літаратурным сакратаром народнага паэта, і ўсе гэтыя гады меў магчымасць бачыць яго ў жыцці і ў працы, слухаць яго мудрую гаворку. І ўсе гэтыя гады вёў дзённік сваіх сустрэч і гутарак з народным песняром. З усіх гэтых запісаў і злажылася надзвычай арыгінальная дакументальна-біяграфічная кніга "Колас расказвае пра сябе", якая з вялікай цікавасцю чытаецца і сёння, бо яна напісана са слоў самога Я. Коласа. Аб гэтым сведчыць і надпіс, які зрабіў М. Лужанін на кнізе, дорачы яе музею: "Тут усё, што пачуў я ад нашага вялікага настаўніка. Шануйце, вучыце яго!".


У Літаратурным музеі Янкі Купалы. Злева направа: Заір Азгур, Даніла Міцкевіч, Максім Лужанін, Аляксей Кулакоўскі. 1970 г.

Вялікае месца ў творчасці паэта займаюць пераклады з іншых моў. На беларускую мову пераклаў "Гора ад розуму" А. Грыбаедава, "Вечары на хутары ля Дзіканькі" і выбраныя творы М. Гогаля, "Маладую гвардыю" А. Фадзеева, "Яны змагаліся за Радзіму" А. Шолахава, паасобныя творы А. Пушкіна, А. Міцкевіча, У. Сыракомлі, У. Маякоўскага і інш.

Шмат дзе пабываў М. Лужанін за сваё жыццё. Але заўсёды яго цягнуў да сябе самы дарагі, самы мілы куточак зямлі, які называецца Салігоршчынай, або, як называў яго сам пісьменнік, Случчына. Сюды, на малую радзіму, ён часта наведваўся, чэрпаючы на поўныя грудзі не толькі знаёмы з дзяцінства водар навакольных палёў, лугоў, сцежак, кветак, дрэў, але і новыя тэмы для сваіх твораў. Так, летам 1977 г. М. Лужанін у чарговы раз пабываў на Салігоршчыне. Спачатку завітаў у родную вёску, сустрэўся з вучнямі Прускай васьмігодкі і перадаў ім кнігі з уласнай бібліятэкі. У 1979 г. паэт зноў на Салігоршчыне.


Вёска Прусы на Салігоршчыне. З Леанідам Шырыным і Паўлам Холадам на месцы, дзе стаяла родная хата. 1984 г.

На гэты раз грамадскасць Салігорска арганізавала ў Палацы гарнякоў урачысты вечар, прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння славутага земляка. Яму было прысвоена званне ганаровага шахцёра і ўручана шахцёрская каска. У 1984 г. пісьменнік зноў на Салігоршчыне, зноў пабываў у роднай вёсцы, а ў Салігорску выступіў перад чытачамі ў кнігарні.


Рада старэйшын. З Марынай Холад і яе сынам, настаўнікам Паўлам Холадам. Прусы. 1984 г.

Жыццё шчодра надарыла паэта багатай біяграфіяй, якая і стала асноўным зместам яго творчай спадчыны. За вялікія заслугі перад народам і Камуністычнай партыяй, за актыўную працоўную, літаратурную і грамадскую дзейнасць народ выбіраў Максіма Лужаніна дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, яму прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча культуры БССР, лаўрэата літаратурнай прэміі Я.Коласа (за кнігу "Колас расказвае пра сябе"), член прэзідыума праўлення Саюза пісьменніка ў БССР. Дзяржава высока ацаніла заслугі М. Лужаніна ў галіне беларускай літаратуры, узнагародзіўшы яго ордэнамі Леніна,

Айчыннай вайны 2-й ступені, Дружбы народаў, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Знак пашаны, а таксама медалямі.

Памёр пісьменнік 13 кастрычніка 2001 г. у Мінску. Быў пахаваны на могілках вёскі Паперня Мінскага раёну, поруч з магілай Яўгеніі Пфляўмбаўм.

## Віктарына па аповесці М.Лужаніна "Добры хлопец Дзік"




*1. Максім Лужанін – гэта літаратурны псеўданім. Сапраўднае імя і прозвішча пісьменніка:* 1) Міхась Лынькоў; 2) Яўген Скурко; 3) Канстанцін Міцкевіч; 4) Іван Луцэвіч; **5)** Аляксандр Каратай.

*2. Аповед у творы вядзецца ад імя:* 1) Марата, сына шаўца Міколы; **2)** першай асобы (аўтара); 3) Дзіка; 4) хлопчыка Лявона; 5) Гаспадыні.

*3. Шэрага пушыстага камячка ў дом Гаспадара прынёс:* 1) Пятро, падлетак, даўні знаёмы аўтара; 2) Саша, аднакласнік старэйшага сына; 3) Мікола, сын брыгадзіра Васіля; 4) Віця, суседскі хлопец; **5)** Марат, сын шаўца Міколы.

*4. Узамен шчанюка хлопчык ад Гаспадара атрымаў:* **1)** кніжку пра Шэрлака Холмса; 2) компас; 3) бінокль; 4) школьны глобус невялікага памеру; 5) энцыклапедыю пра сабак.

*5. Мянушку Дзік для сабакі прапанаваў (прапанавала):* 1) Марат, сын шаўца Міколы; 2) жончына сястра Наташа; 3) Іна, дачка Наташы; **4)** паляўнічы Валянцін; 5) пяцікласнік Лявон.

*6. Ранейшая мянушка Дзіка:* 1) Шарык; **2)** Брэх; 3) Барон; 4) Тузік; 5) Гаў.

*7. Парода Дзіка:* 1) аўчарка альпійская; **2)** звычайны дваровы сабака; 3) бульдог амерыканскі; 4) далмацінец; 5) доберман.

*8. Як госці называлі гаспадара Алеся?* 1) Міканор; 2) Міхаіл; **3)** Максім; 4) Мікалай; 5) Мікіта.

*9. "Дома мы яго лічылі за сямейніка, сціплага сваяка, што ўсё чыста разумее, усім спагадае, толькі параіць не можа, не ўмее загаварыць". А хто з пералічаных асоб не быў хатнім, сямейнікам?* 1) Гаспадар; 2) Гаспадыня; 3) Наташа, жончына сястра; 4) Іна, дачка Наташы; **5)** Марат, сын Міколы.

*10. Дзік страшэнна не любіў:* 1) заставацца адзін дома; 2) калі на яго цэлы дзень сям'я Гаспадара не звяртала ўвагі; 3) іншых сабак, якія бегалі па вуліцы; 4) суседскіх катоў; **5)** калі Гаспадар выязджаў з дому.

*11. Праз колькі часу "з шаравата-рудога камячка поўсці на таўсматых лапах" вырас "дужы, ростам з дога, пёс са звычайнай для гэтай пароды моцнай і шырокай грудзінай"?* 1) праз 4 месяцы; 2) 8 месяцаў; **3)** адзін год; 4) адзін год і 6 месяцаў; 5) два гады.

*12. Заклятым вораг Дзіка:* 1) руды сабачка; **2)** кот Хама; 3) суседскі певень; 4) Іна, дачка Наташы; 5) паляўнічы Валянцін.

*13. Пра здарэнне з рудым сабачкам у парку было расказана:* 1) Рыгору Барадуліну; 2) Уладзіміру Караткевічу; 3) Міхасю Лынькову; 4) Янку Купалу; **5)** Якубу Коласу.

*14. Кату, які жыў у Гаспадара, далі мянушку Хам, а пазней – Хама:* 1) пасля сваркі з рудым сабачкам; 2) з'яўлення Дзіка ў сям'і Гаспадара; **3)** выпадку са шчупаком; 4) таго, як Дзік адабраў аладку ў Іны; 5) здарэння ў завулку.

*15. Дзіку самастойна ўзяць аладкі са стала прапанаваў (прапанавала):* 1) Іна, пляменніца Гаспадара; **2)** Гаспадар Алесь; 3) Гаспадыня; 4) Наташа, жончына сястра; 5) браты Алік і Лявон.

*16. Марату, сыну шаўца Міколы, было:* **1)** 11 гадоў; 2) 9 гадоў; 3) 10 гадоў; 4) 12 гадоў; 5) 13 гадоў.

*17. Частка маленства Марата прайшла:* 1) у стрыечнага брата ў г. Салігорску; 2) дзядзькі і цёткі, якія жылі ў горадзе; 3) вёсцы ў бабулі і дзядулі за 70 кіламетраў ад горада; **4)** горадзе, акупаваным фашыстамі; 5) інтэрнаце для дзяцей, чые бацькі загінулі ў час вайны.

*18. Для Дзіка не характэрны:* 1) высакароднасць, разважлівасць, манера заўсёды трымацца ўпэўнена; 2) далікатнасць, выхаванасць, адданасць; 3) незласлівасць, стараннасць, самаадданасць; **4)** помслівасць, нахабнасць; 5) дабрыня, розум, смеласць.

*19. Колькі гадоў мінула, як дом Гаспадара збяднеў на аднаго сямейніка?* 1) 5 гадоў; 2) 10 гадоў; 3) 15 гадоў; **4)** 20 гадоў; 5) 25 гадоў.

*20. Якую памяць пакінуў пасля сябе Дзік?* 1) у яго гонар зацвердзілі медаль "За вернасць і адданасць"; 2) над ім насыпаны пачэсны курганок са стэлаю; **3)** засталася памяць пра "позірк разумных карых вачэй, зайздросную пільнасць, тонкую чуласць, ахвярную адданасць", пра вялікае сабачае сэрца; 4) Гаспадар малога шчанюка, якога ўзяў, назваў таксама Дзікам, гэта як знак падзякі, памяці; 5) вуліцу, на якой жыла сям'я Гаспадара, перайменавалі ў гонар Дзіка.

*21. Другарадным літаратурным героем у творы з'яўляецца:* 1) Гаспадар; 2) Гаспадыня; 3) кот Хама; 4) Дзік; **5)** жончына сястра Наташа.

*22. Кульмінацыяй у творы з'яўляецца:* 1) момант, калі Дзік аднаго разу пакараў ката Хаму; 2) з'яўленне Дзіка ў сям'і Гаспадара; 3) урывак, дзе расказваецца пра змяненне мянушкі сабакі; **4)** эпізод, калі Дзік прыціснуў рабаўніка да плота, "паклаўшы яму лапы на плечы, рычаў і дабіраўся да гарлянкі"; 5) здарэнне ў парку з рудым сабачкам.

*23. Якім вобразна-выяўленчым сродкам (мастацкім тропам) з'яўляюцца падкрэсленыя словы:* ***"Мы з Дзікам ішлі па вуліцы і спявалі. Да гэтага хіліў падтуманены маёвы ранак, <u>неабуджаная цішыня</u> ў горадзе":*** 1) эпітэт; 2) параўнанне; **3)** метафара; 4) гіпербала; 5) гукапіс.

*24. Спецыяліст, які вывучае сабак, іх пароды, звычаі, паводзіны, умовы ўтрымання і развядзення, – гэта:* 1) арнітолаг; 2) марыніст; **3)** кінолаг; 4) заатэхнік; 5) ветэрынарны ўрач.

## Рэкамендуем правесці мерапрыемствы, прысвечаныя М. Лужаніну:

- “Жыццёвымі сцежкамі пісьменніка”: *агляд творчасці*
- “Талент Салігоршчыны”: *літаратурная гадзіна*
- “Майстар беларускай паэзіі”: *літаратурны вечар*
- “Дарогамі Максіма Лужаніна”: *творчы партрэт*
- “Натхненне і майстэртва: творчасць Максіма Лужаніна”: *гутарка-знаёмства з творчасцю пісьменніка;*
- “Напеў зямлі маёй”: *літаратурная вечарына*
- “І адгукнецца слова ў слове…”: *кніжная выстава*
- “Прасторы творчасці”: *літаратурны вечар*
- “Роднай мовы пясняр”: *вечар-партрэт*



# Паэтычная старонка

### Пахне спелай антонаўкай восенькі сад…

Пахне спелай антонаўкай восенькі сад…
Пастаю, адыду і вярнуся назад.
Ціха, яблык, не падай,
Не будзі маю радасць,
Да відна не будзі,
Пасядзі
На галіне –
Хай паспіцца дзяўчыне.

А крыніца паціху булькоча ў кустах
Аб зялёных вачах і аб мілых руках,
Што красуня лясная
Пра мяне ўспамінае…
Дык, ручай, не шапчы,
Зацурчы
Па даліне, -
Час прачнуцца дзяўчыне!

І мы самі, як хвалі крынічнай пары,
Цераз луг, цераз свет паплывём на зары.
Ужо нашы прасторы
Там, дзе месяц і зоры.
Хутка ноч праміне,
У акне
Стала сіне, -
Час выходзіць дзяўчыне!

***

### Дарада сэрцу

Маркотна мне вясну страчаць у мяккім ложку.
Хваробы – што рабіць! – бяруць сваё патрошку,
Пільнуюць з-за вугла: не разыходзься дужа,
Пара на тармазы больш націскаць, мой дружа!
Марней, хадзі цішком у медыцынскіх лейцах,
Абы не хваляваць і не натужыць сэрца.
Астудзіш так яго, і ўжо не сэрца будзе,
А торбачка крыві, што ні сабе ні людзям...
Хутчэй устань, ідзі, у твар глядзі пагрозе,
Парвіся, сэрца, лепш ты з песняю ў дарозе.

***

## На ўсходзе сонца

Зноў як раней у краі тым:
Высакагорныя абвалы,
Лясы, над прорвамі масты...
І сонца ціхенька спытала:
– А дзе забавілася ты?
Ты скрозь пазнілася тады.
Машыны, вадаспады, людзі
– Усе збіваліся з хады,
Але ўсміхаліся марудзе
І даравалі: – Паўбяды!
А як уцешна мне было,
Што сонца, хоць усе абшары
Даўно чакалі на святло,
Пакуль ты хустачку да твару
Не завязала, – не ўзышло!

***

## Чарнобыльскі вецер

Вёска.
Золак.
Зор скупая жменька.
Сама раз турботы пачынаць.
Анікім-кагенька, анічым-чагенька,
Не чутно ні вераб'я, ні певуна.
Можа, пад нядзельку позна спаць палеглі,
Ціха і ў суседзяў на двары.
Дзе ж ты, дзядзька Лаўрык, дзе ж вы, цётка Тэкля?
Было ўсюды поўна вас аб той пары.
Дзверы незамкнуты. Выйшлі ненадоўга:
Можа, дзе бяруць баравікі,
Ці каровы пасвіць выпала радоўка,
Ці ў царкву на споведзь клікнулі грахі?
Пэўна, заблудзіў я, не туды прыехаў,
– Мне павінен ціўкнуць голас хоць адзін...
З вокнаў хат гарбатых вецер гоніць рэха
Пад крыжы.
За вёску.
З палыну ў палын.

***

## Восень

Ходзіць восень з жоўтым клункам,
Носіць дрэвам падарункі:
Дубу-асілку –
Залатую пасцілку,
Сукенку – асіне,
Ліпам – па хусціне,
А кустам усім у пушчы
Па барвовай яркай хустцы.

***

## Пад цымбалы

Кацярынка мая,
Нежурынка мая!
Калі ты мяне забыла,
Прыгадай салаўя!

Пахадзі над ракой
З камарынай талакой,
Калі месяц зойдзе ў хмару,
Памахай мне рукой.

***

## Дарога песні

Пушчай ідзеш ці пусткаю,
Дома, ў чужой зямлі,
Песня, будзь беларускаю
І пад вясельнай хусткаю
І ў баявым шынялі.
Людзі з вуснаў у вусны
Прымуць, перададуць,
Толькі будзь праўды лустаю,
Толькі сабою будзь.
Хмелю густую брагу,
Белы убор калін,
Сонца ліпнёвых ягад,
Нівы тугі наліў, –
Несла ты сцежкай грузкаю,
Вузкай, без каляін...
З вогненнай сцежкай грузкаю
Выйшла ў свет беларускаю,
Як цябе ні клялі.

***

## Творы Максіма Лужаніна:







1. Лужанін, М. Збор твораў.Т. 1-4. / Максім Лужанін. – Мінск, 1979-1981.
2. Лужанін, М. Сустрэчы: да 100-годзя Я.Купалы і Я.Класа / Максім Лужанін. – Мінск, 1982.
3. Лужанін, М. Вярнуся ветрам: лірыка, гумар, сатыра / Максім Лужанін. – Мінск, 1987.
4. Лужанін, М. Лявоніха. Паэмы і вершы / Максім Лужанін. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1977. –160с.
5. Лужанін, М. Прага крыла: паэзія / Максім Лужанін. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1974. –304с.
6. Лужанін, М. Рэпартаж з рубцом на сэрцы / Максім Лужанін. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1972. –208с.

## Аб жыцці і творчасці Максіма Лужаніна:

1. Андрыенка, М.А. Жыццёвым сцежкам пісьменніка: да стагоддзя Максіма Лажаніна / М.А. Андрыенка // Шахцёр. – 2009. – 29 кастрычніка. – С. 5.

2. Арочка, М.М. Споведзь і летапіс / Арочка М.М. // Саюз часу і майстэрства: літ. крытыка. – Мінск, 1981. – С. 210 – 222.

*У гэтай кнізе паэта і даследчыка паэзіі Міколы Арочкі ёсць сваё свежае прачытанне твораў Я.Купалы, А.Куляшова, Ул.Дубоўкі, М.Танка, М.Лужаніна, цікавыя думкі аб сучаснай і класічнай паэзіі.*

*Эмацыянальнасць мовы, прастата і яснасць выкладання робяць кнігу цікавай не толькі для спецыялістаў-філолагаў, але і для шырокага кола чытачоў.*




3. Бечык, В. Прасторы творчасці / Бечык В.Л. // Прад высокаю красою…: літ.-крытыч. Артыкулы. – Мн.: Маст. Літ., 1984. –С.66 – 79.

4. Глебка, П. Бясспрэчны поступ / Глебка П.// Паэзія барацьбы і перамогі: артыкулы. – Мінск, 1973. – С.114-121.

5. Гніламёдаў, У. Натхненне і майстэрства / Уладзімір Гніламёдаў // Роднае слова. – 1998. - №5. – С. 9 – 20. Творчасць Максіма Лужаніна.

6. Гніламёдаў, У. Майстар // Гніламёдаў У. // Як само жыццё: кніга бягучай крытыкію – Мн.: Маст. Літ., 1980. – С.116 – 132.

7. Куварина, Т. «Всегда же со мною твой образ...»: переписка Максима Лужанина и Евгении Пфляумбаум / Татьяна Куварина // Неман. – 2011. – №6. – С. 158-189.

8. Лазарук, М.А. "І крыла дужэе ўзмах" / Лазарук М.А.// Часу непадуладнае: літ. крыт. і публіцыст. артыкулы. – Мінск, 1981. – С. 27 – 31.





*У кнігу ўвайшлі лепшыя літаратурна-крытычныя артыкулы, напісаныя выдомым літаратуразнаўцам і педагогам, членам-карэспандэнтам АН СССР М.Лазарчуком. У іх даследуюцца гістарычныя шляхі і сучасны стан беларускай паэмы, аналізуецца творчасць М.Лужаніна, П.Панчанкі і інш., вядзецца заклапочаная размова пра выкладанне роднай літаратуры ў школе.*

9. Лужанін Максім // Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. слоўн. – Мінск, 1994. – Т.4. – С. 80 – 83.

10. Лужанін Максім // Беларускія пісьменнікі (1917 – 1990): давед. – Мінск, 1994. – С. 341 – 342.

11. Лужанин Максим // Минская область: энциклопедия: В 2 т./ редкол.: Л.Ф. Крупец, Г.П.Пашков и др. – Минск: БелЭН, 2007. – Т.2. – С. 294-295.

12. Лужанін Максім // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Салігорскага раёна. – Мінск, 2004. – С. 497 – 500.

13. Лужанин Максим // Республика Беларусь: энциклопедия: В 6 т./ редкол.: Г.П.Пашков и др. – Минск: БелЭН, 2006. –Т. 3. – С.555.

14. Лужанін Максім // Энцыкл. літ. і мастацтва Беларусі.– Мінск, 1986. – Т. 3. — С. 298 - 299.

15. Лужанін, М. Мова гартуе і спеліць нацыянальныя пачуцці / Максім Лужанін; гутарыў М.Скобла // Бярозка. – 1997. – №9. – С. 14 - 15.

16. Гутарка з беларускім пісьменнікам Максімам Лужаніным.

17. Максім Лужанін // Пісьменнікі Савецкай Беларусі: кароткі біябібліяграфіч. даведнік. – Мінск, 1970. – С. 229.

18. Мэтр беларускай паэзіі: 95 гадоў з дня нараджэння паэта Максіма Лужаніна // Шахцёр. – 2009. – 2 лістапада. – С. 3.

19. Паўлаў, У. Неразлучны з вятрамі / У. Паўлаў // Полымя. – 1989. – №11. – С. 182 - 186.
20. Пра беларускага пісьменніка Максіма Лужаніна.

21. Рагойша, В.П. Права на верш / Рагойша В.П. // І адгукнецца слова ў слове...: літ.-крытыч. Арт., эсэ, дыялогі. – Мінск, 1992. – С. 47 – 52.

22. Сачанка, Б. Дарогамі Максіма Лужаніна / Б.Сачанка // Маладосць. – 1989. - №10. – С. 155 – 164.

23. Сачанка, Б.І. Дарогамі Максіма Лужаніна / Сачанка Б.І. // Сняцца сны аб Беларусі... – Мінск, 1990. – С. 310 – 320.

24. Таленты Салігоршчыны: Максім Лужанін // Салігорскі веснік. – 1994. – 23 сакавіка. – С. 5.

25. Шамякіна, М. Максім Лужанін: біяграфія і творчасць / Марыя Шамякіна // Полымя. – 2006. – №11. – С. 151 – 154.

26. Шырын, Л. Яшчэ багата будзе вершаў: М.Лужаніну – 75 гадоў / Леанід Шырын // Шахцёр. – 1984. – 2 лістапада.

Складальнік: Андык, Н.М.

ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”

Аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы